ныя гаршкі, міскі і кубкі. Шмат вырабаў з рогу і косці — наканечнікі стрэл, праколкі, рыбалоўныя кручкі, гарпуны, кінжалы, сякеры, цёслы і інш. Сярод упрыгожанняў найбольш свідраваных падвесак з зубоў жывёл і падвесак з бурштыну. Знойдзены рэчы старажытнага мастацтва — драўляныя і касцяныя фігуркі чалавека, звяроў і птушак, гравіраваныя выявы людзей на кераміцы. Выяўлены частка жытла слупавой канструкцыі, рэшткі драўляных місак, дошак, агароджы з жэрдак.

356в. Стаянка-3. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на пясчаным узгорку Аксінаў Груд. Даследаваў у 1968 г. М. М. Чарняўскі. На паверхні ўзгорка трапляліся крамянёвыя прылады працы і кераміка, а ў торфе каля паўночна-ўсходняга падножжа — рэшткі драўляных збудаванняў. Адносіцца да бронзавага веку.

356г. Стаянка-4. За 1,8 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Брускавішча. Даследаваў у 1971, 1976—77 гг. М. М. Чарняўскі. Выяўлены матэрыялы ранняга неаліту (4-е тысячагоддзе да н. э.).

Матэрыялы раскопак захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР і Дзяржаўным музеі БССР.

Літ.: Поликарпович К. М. Торфяниковые стоянки Кривина и Осовец в БССР.— У кн.: Бюллетень Комиссии по изучению четвертичного периода. М.; Л., 1940, № 6—7; Чернявский М. М. Новое неолитическое поселение на Кривинском торфянике.— У кн.: Доклады к XI конференции молодых ученых Белорусской ССР. Мн., 1967; яго ж. Фигурка человека со стоянки Осовец-II.— Советская археология, 1967, № 4; яго ж. Исследование неолитических поселений Кривинского торфяника.— У кн.: Древности Белоруссии. Мн., 1969. *М. М. Чарняўскі.*

в. Астроўна, цэнтр сельсавета

357. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі, каля шашы на Віцебск. Пахаваны 177 воінаў 54-га гвардзейскага стралковага палка 19-й гвардзейскай стралковай дывізіі 39-й арміі 3-га Беларускага фронту, якія загінулі пры вызваленні в. Астроўна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 г. У 1969 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

358. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 800 м на паўднёвы ўсход ад вёскі, каля дарогі на в. Плісы. Пахаваны 300 мірных жыхароў, расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі 21.9.1941 г. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

359. МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА САВЕЦКІМ ВОІНАМ (гіст.). На будынку Дома культуры. Устаноўлена ў 1975 г. ў гонар воінаў 54-га гвардзейскага стралковага палка 19-й гвардзейскай стралковай дывізіі (камандзір — палкоўнік Ф. Х. Палявой) 39-й арміі 3-га Беларускага фронту,



357. *Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў.*

якія 26.6.1944 г. вызвалілі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў в. Астроўна.

360. МЕСЦА БОЮ 1812 г. (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі.

У Айчынную вайну 1812 г. каля в. Астроўна 13—14(25—26).7.1812 г. адбыліся баі часцей 1-й рускай арміі (каля 9 тыс. чалавек) супраць французскіх войск (больш за 20 тыс. чалавек). 13 ліпеня пяхотны корпус генерала А. І. Остэрмана-Талстога і 4 палкі кавалерыі ўвесь дзень стойка трымалі абарону. Падмацаваныя пяхотнай дывізіяй генерала П. П. Канаўніцына 14 ліпеня рускія войскі прадаўжалі бой каля вёсак Кукавячына і Дабрэйкі, потым арганізавана адышлі. Баі садзейнічалі злучэнню 1-й і 2-й рускіх армій каля Смаленска.

У 1962 г. з нагоды 150-годдзя бітвы



360. *Помнік на месцы бою 1812 г.*

пастаўлена стэла з мармуровай дошкай, на якой выбіты памятны тэкст.

М. К. Кошалеў.

361. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). На паўночнай ускраіне вёскі, каля шашы Віцебск — Бешанковічы. На ўшанаванне памяці 288 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. пастаўлены абеліск.

в. Бачэйкава, цэнтр сельсавета

362. БРАЦКАЯ МАГІЛА ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ (гіст.). У цэнтры вёскі, насупраць будынка выканкома сельсавета. Пахаваны 21 чырвонаармеец, якія загінулі ў сярэдзіне сакавіка 1918 г. ў баі супраць нямецкіх войск і атрадаў корпуса Доўбар-Мусніцкага ў раёне Бачэйкава. У 1956 г. на магіле пастаўлены абеліск.

Літ.: Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920 гг.: Сб. документов и материалов. Т. 1.— Мн., 1968.

В. Б. Караткевіч.

363. КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК (археал.). У вёсцы, на сядзібах І. Трашчоткіна і М. Пясоцкага. 2 насыпы. Вышыня аднаго 1,7 м, дыяметр 11 м, другога адпаведна — каля 2 м і каля 12 м. Вядомы з 1873 г. Абследавалі ў 1972 г. М. М. Чарняўскі, у 1981 г. Э. М. Зайкоўскі. Раскопкі не праводзіліся.

364. МАГІЛА ВЕРАБ'Я А. Г. (гіст.). Насупраць будынка праўлення калгаса «Бачэйкава». Маёр Чырвонай Арміі А. Г. Верабей загінуў у баі супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў 29.6. 1944 г. У 1958 г. на магіле пастаўлены абеліск.

365. ПАРК (архіт.). За 500 м на паўднёвы ўсход ад вёскі, на правым беразе р. Ула. Закладзены пасля 1769 г. Парк рэгулярнага тыпу. Размешчаны на прыпойменным верхнім плато і пакатым схіле, апрацаваным 3 паралельнымі тэрасамі, якія спускаюцца да ракі (перапад 2 м).

Цэнтрам сіметрычна-восевай кампазіцыі парку быў мураваны аднапавярховы палац (закладзены ў 1769 г., не збярогся). Перад ім размяшчаўся авальны партэр, да якога вялі 2 узаемна перпендыкулярныя алеі. Адна з іх па восі ўсход — захад (па фронту будынка) вядзе да службовага флігеля і падзяляе тэрыторыю парку на 2 зоны. Перад палацам масіў ліп і таполяў, пасаджаных па рамбічнай планіровачнай сетцы. Частка парку за палацам афармлена газонамі, шпалерамі, баскетамі, фантанам, лабірынтам. Складаная камбінацыя дарожак утварала манаграму ініцыялаў уладальніка маёнтка і геральдычныя фігуры фамільнага герба. Тут раслі ліпы, бэз персідскі, гартэнзія мяцёлчатая, кедры, паўночнаамерыканскія елкі. Некалькі штучных вадаёмаў, размешчаных у вуглавых частках парку, маюць правільную форму (квадрат, прамавугольнік, авал). З заходняга боку да парку прымыкаў сад, акружаны па перыметры алеямі. Га-